**Шаноўны і дарагі Павел!**

Я кінематаграфіст, і з твару чалавека магу шмат чаго прачытаць.
На Вашым фотаздымку я бачу рашучага, годнага мужчыну з роўным позіркам і моцнай харызмай.
Такога чалавека не могуць зламаць дзясяткі арыштаў і знаходжанне ў камеры, збіванні міліцыяй ці іншыя перашкоды. Такога чалавека гэта ўсё толькі ўзмацняе і пераконвае пра сэнсоўнасць таго, за што ён змагаецца. Менавіта такія людзі для таталітарнага рэжыму бываюць самымі небяспечнымі, бо рэпрэсіі могуць аддаліць, але не перамагчы іх веру і перакананні.
З фотаздымку я адчуваю яшчэ нешта: Вас ніхто і нічога не спыніць. Вы даводзіце гэта і сваімі пратэстамі са сваіх 14 гадоў. Пагрозай для свабоды бывае толькі абыякавасць. А з яе – безумоўна, і з Вашым удзелам –беларускі народ удалося абудзіць. Я захапляюся Вашай нязломнасцю, якая ў цяперашні час для многіх суграмадзян можа быць не толькі натхненнем, але і падмацункам.
Нават калі б агонія таталітарнага рэжыму неяк зацягнулася, перамагчы не можа той, хто на вуліцах у сваёй празе ўлады адчайна страляе і атакуе людзей з голымі рукамі, жанчын з малымі дзецьмі ў вазочках.
Свабода ніколі не бывае задарма, але я веру, што ў Вас застанецца досыць сілы, каб як найлепш яе абараніць і пасля таго, як вы яе здабудзеце.
Вашы дзеці некалі будуць вельмі ганарыцца Вамі!
Зычу Вам і Вашым блізкім толькі найлепшае. А Беларусі – шчаслівую будучыню ў вольнай, дэмакратычнай Еўропе.

З павагай

**Фэра Фэніч**

рэжысёр і прадусар,
прэзідэнт Міжнароднага кінафестывалю Praha –Febiofest,
ініцыятар надання пражскаму аэрапорту імя Вацлава Гаўла

www.ferofenic.cz

## Фэра Фэніч (нар. 1951)

славацкі і чэшскі кінарэжысёр, сцэнарыст, прадусар, тэлевізійны і кінапрадпрымальнік.



Фэра Фэніч паходзіць са Славакіі, дзе спачатку ў 1969 годзе паступіў на кафедру журналістыкі філасофскага факультэта Універсітэта Коменскага ў Брацiславе, адкуль пазней перайшоў на кафедру дакументальнай творчасці кінаакадэміі (FAMU) у Празе. Пасля яе сканчэння ў 1978 годзе год адслужыў у Чэхаславацкім армейскім кінацэнтры ў якасці асістэнта рэжысёра, а пазней стаў супрацоўнікам Студыі кароткаметражных фільмаў Славацкай кінатворчасці ў Брацiславе-Колібе (1979–1985), дзе зняў некалькі аўтарскіх дакументальных фільмаў. Таксама ў пражскай студыі “Барандаў” зрабіў некалькі твораў, напрыклад, свой першы аўтарскі паўнаметражны мастацкі фільм “Сокавы раман” (1984). У 1986 годзе быў вымушаны пакінуць студыю ў Брацiславе з прычын т.зв. антысацыялістычнай дзейнасці, і ў Празе некалькі гадоў зарабляў як экскурсавод. У 1989 годзе зняў у Празе другі паўнаметражны фільм “Асаблівыя стварэнні” аб прадказанні падзення камунізму.
У 1991 годзе заснаваў уласную незалежную кінакампанію “FEBIO” (“Feničův Biograf”), якая дагэтуль стварае аўтарскія дакументальныя творы. Таксама Фэра Фэніч – заснавальнік і лідар вядомых тэлевізійных праектаў, напр., “Gen”, “Genus”, “Česká soda”, “Cestománie”. Потым, у 1993 годзе, заснаваў кінаагляд незалежнага кіно “FEBIOFEST” – на сённяшні дзень адзін з самых вядомых кінафестываляў міжнароднага маштабу.
Фэра Фэніч у 1990-1994 гг. працаваў у пражскай кінаакадэміі вядучым педагогам курса рэжысуры; за сваю шматгадовую дзейнасць быў уганараваны, напрыклад, “Прэміяй 1 чэрвеня 1953 года” за грамадзянскую і палітычную публіцыстыку, якую ўручае горад Плзэнь. Як рэжысёр дагэтуль зняў 36 розных фільмаў.

# Фэра Фэніч

→

# Павел Юхневіч



## Павел Юхневіч (36 гадоў)

ад сваіх 14 гадоў актыўна ўдзельнічае ў палітычным жыцці і акцыях пратэсту, многія з якіх дапамагаў арганізаваць. Быў адным з заснавальнікаў моладзевай арганізацыі “Зубр”, актыўным сябрам некаторых іншых аб’яднанняў, напр. Малады Фронт або Еўрапейская Беларусь. Дзясяткі разоў арыштоўваўся і бываў збіты міліцыяй. Са школы выключаны праз свой актывізм, выпускныя іспыты змог здаць толькі на сем гадоў пазней. Працаваў пераважна ў рабочых прафесіях. Заўжды падкрэсліваў неабходнасць мірнага пратэсту. Апошні раз затрыманы 25 верасня, супраць яго высунута абвінавачанне ва ўдзеле ў масавых беспарадках. Разам з жонкай выхоўвае дзве дачкі.